адпраўляецца з Вільні ў Полацк, знаёміцца з кампаніяй Івана Іванавіча, у размовах з якой упершыню і прэзентуюцца пазарэалістычныя ідэі. Наратар знаёміцца з Падземным чалавекам, “спецыяльнасцю яго было знанне розных фантастычных легенд аб падзямельных хадах і дзівах, скрытых у іх, якія ён імеў апавядаць з паражаючым рэалізмам, але на заканчэнне заўсёды дадаваў: “Так пераказуюць, а хто ж ведае, ці ёсць у гэтым хоць кропля праўды” [2, 6].

Тут варта звярнуць увагу на наступны моўна-стылёвы аспект: як адзначаў Ц. Тодараў, у фантастычных творах вельмі часта “фігуральны выраз уводзіцца фармулёўкай мадалізацыі: “быццам”, “назвалі б”, “падобна было на тое”, “нібы” і г. д.” [1, 70]. Тое ж бачым і ў тэксце Ластоўскага: уводзіцца аповед пра міфічныя падзямельныя хады, пры гэтым невераагоднасць інфармацыі дапускаецца як факт, пачуты ад некага (“Так пераказуюць, а хто ж ведае…”). Таму фантастычныя моманты гіпатэтычна ўключаюцца ў рэалістычныя акалічнасці дадзенай гісторыі.

У наступных эпізодах Падземны чалавек распавядае пра тое, што Замкавая гара ў Полацку – насыпаная, што насамрэч гэта проста магіла “валадара ўсёй балтыйскай “ратайскай” Скіфіі” [2, 7], на якой пазней стаяла бажніца Дзеве-Сонцу, і праз гэта каля гары без праблем можна знайсці медалі з яе выявай і малюнкамі “характэрнага вельмі, але не бачанага мной дагэтуль стылю” [2, 7]. Размова герояў заходзіць пра тое, што стыль гэтых малюнкаў сведчыць пра вялізны ўзровень культуры далетапіснага Полацку, пра ступень развітасці ў ім астраноміі, пра сінанімічнасць словаў “жрэц” і “яцвяг” у старажытныя часы, пра Полацкую бібліятэку, у якой ляжыць пісаны рукой Еўфрасінні Полацкай том “Полацкага летапісу”, арыгінальная “Аповесць мінулых гадоў” і г.д.

Кажучы іншымі словамі, распавядаецца пра рэчы, якія не надта супярэчаць сучаснай навуцы, але толькі таму, што яна проста не мае дастаткова ведаў пра іх, але ж для твора гэтыя рэчы з’яўляюцца прынятымі, зразумелымі і лагічнымі для персанажаў. Такім чынам, можна зрабіць вывад, што гэты твор мае навукова-фантастычную скіраванасць, пры гэтым, у адрозненне ад іншых прадстаўнікоў жанру, дзе апавядаецца пра дасягненні дакладных і прыродазнаўчых навук, тут вядзецца размова перадусім пра навукі гуманітарныя, што робіць аповесць Ластоўскага яшчэ больш унікальнай у жанравым вызначэнні.

Далей сюжэт развіваецца ў падзямеллі пад Полацкам, і ўжо сам асяродак дэтэрмінуе градацыю навукова-фантастычных сведчанняў: аповед пра Трою як славянскае паселішча, пра сувязі старажытных грэкаў і славян, пра суадносіны рэлігій свету з “нашай старой верай” [2, 24], пра існаванне ў славян рунічнага і іераграфічнага пісьма, пра паходжанне літары “я” з іерогліфа чалавека, літары “ж” з іерогліфа жука, а літары “з” – ад змяі і шмат шмат іншых прыкладаў. Аўтарам уводзяцца асобныя праявы менавіта “тэхнічнай”, а не “гуманітарнай” навуковай фантастыкі. Па-першае, гэта факт існавання новага хімічнага элемента, гетына, (дзякуючы яму ў падзямеллі заўсёды светла, і людзі, якія ў гэтым горадзе жывуць, ніколі не старэюць), а, па-другое, стварэнне вучонымі “крывіна”, аналага міфічнага філасофскага каменя, які можа разбіваць рэчы на складнікі-элементы, а з іх ствараць, ўсё, што толькі захочацца.

Наступным фантастычным сюжэтным штрыхом у творы стала сустрэча пратаганіста з дзіўнай постаццю. Тая тройчы б’е ў шчыт, і герой страчвае прытомнасць. Пасля гэтага загадкавасць і містычнасць мастацкага аповеду ўзрастаюць: герой прачынаецца ў гатэльным нумары, да яго прыходзіць, нібы прывід, Падземны чалавек, наратар не можа ўспомніць, як прайшоў мінулы дзень, атрымлівае таямнічую тэлеграму з просьбай вярнуцца дадому, а ў Вільні невытлумачальнае кола абставін памнажаецца. У адпаведнасці з лепшымі сусветнымі жанравымі традыцыямі фінал аповесці застаецца адкрытым. Тут пануюць загадкавасць і недасказанасць, чытач не можа дакладна сказаць, як трэба асэнсаваць падзеі: шукаць у іх рацыянальнае ці пакінуць тлумачэнне на звышнатуральнае. У выніку гэта таксама можна лічыць адным з атрыбутаў фантастыкі. Як пісаў Луі Вакс, “ідэальнае фантастычнае мастацтва ўмее трымацца ў няпэўнасці, нявызначанасці” [1, 40].

**Заключэнне.** Такім чынам, аповесць Ластоўскага “Лабірынты” з’яўляецца фантастычным, нават навукова-фантастычнам творам, досыць унікальным па сваёй ідэйна-мастацкай спецыфіцы, як у жанравых рамках, так і ў кантэксце айчыннай літаратуры.


1. Тодоров, Ц. Введение в фантастическую литературу / Ц. Тодоров. – Москва: Дом интеллектуальной книги, 1997. – 144 с.
2. Ластоўскі, В. Ю. Лабірынты. Выбраныя творы / В.Ю. Ластоўскі. –Мінск: Папуры, 2015. – 238 с.


## ФУНКЦЫІ ЛІД-АБЗАЦАЎ У ГАЗЕТНА-ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫМ ТЭКСЦЕ


***Лукашова Л.В.,***

*студэнтка 4 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

Навуковы кіраўнік – Семянькова Г.К., канд. філал. навук, дацэнт


Лід-абзац, з’ўляючыся абавязковай часткай загаловачнага комплексу, нароўні з загалоўкам вызначае далейшы лёс матэрыялу. І калі асноўная задача загалоўка – заахвоціць чытацкую аўдыторыю звярнуць увагу на артыкул, то функцыя лідуючага абзаца – утрымаць чытача, каб ён працягнуў чытанне [1]. У рускім мовазнаўстве структурныя кампаненты журналісцкага артыкула, у тым ліку і лід-абзацы, раз-

Рэпазіторый ВДУ

глядаюцца ў працах такіх навукоўцаў, як М.М.Кім, Г.В.Лазуціна, А.В.Калеснічэнка, М.І.Шостак і інш. У беларускім жа мовазнаўстве пералічаным вышэй пытанням пакуль што не ўдзяляецца належная ўвага. Менавіта таму даследаванне функцый лід-абзацаў у складзе загаловачнага комплексу беларускамоўных артыкулаў СМІ застаецца актуальным.

Мэта артыкула – выяўленне асаблівасцяў функцыянавання лідуючых абзацаў у тэкстах беларускамоўных СМІ.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам паслужыла картатэка, сабраная аўтарам з наступных беларускамоўных інтэрнэт-версій газет: “Наша Ніва”, “Звязда”, “Беларускі партызан”, “Рэгіянальная газета”, а таксама з інфармацыйных інтэрнэт-рэсурсаў “БЕЛ спутнік” і “Белта” за 2018 год. Выкарыстаны апісальны, тэкстуальна-аналітычны і супастаўляльны метады даследавання.

**Вынікі і абмеркаванне.** Даследаванне беларускамоўных публіцыстычных тэкстаў паказала, што функцыі лід-абзацаў мала чым адрозніваюцца ад функцый загалоўкаў, сфармуляваных Э.А. Лазаравай [2], што дазволіла нам вылучыць наступныя функцыі лід-абзацаў: 1) *вылучальна-графічная*, якая рэалізуецца праз разнастайныя графічныя сродкі (шрыфт, колер, размяшчэнне лід-абзаца ў тэксце); 2) *інфарматыўная*: лід, у сціслай форме паведамляючы найбольш важныя аспекты інфармацыі, адлюстраванай у тэксце, абуджае цікавасць да твора ў цэлым; 3) *рэкламная*: лід удзельнічае ў фарміраванні настрою чытача, дзякуючы ліду канцэнтруецца ўвага чытача на тэксце; 4) *ацэначна-экспрэсіўная*: лід-абзац аказвае ўздзеянне на чытача праз стылістычныя прыёмы, акцэнтуе ўвагу на асобных сэнсавых частках публікацыі; 5) *інтэгратыўная*: лідуючы абзац заўсёды звязаны з асноўнай часткай журналісцкага тэксту; 6) *кампазіцыйная*: лід прагназуе архітэктоніку тэксту, яго чляненне на абзацы.

Заўважана, што ў даследаваных намі лідуючых абзацах рэалізуюцца абсалютна ўсе вышэйназваныя функцыі. Інфарматыўная функцыя ліда выяўляецца ў тым, што ў ім у сціслай форме выражаецца змест твора, перадаюцца яго ключавыя моманты, падказваецца чытачу аўтарская канцэпцыя і ракурс разгортвання думак: *«На сайце Ulej стартавала кампанія ў падтрымку беларускага перакладу кнігі “Стамбул”. Расказваем, хто такі Архан Памук і чаму яго варта чытаць»; «У Брэсце з балкона сваёй кватэры на чацвёртым паверсе выпала 37-гадовая жанчына. Пацярпелая знаходзіцца ў рэанімацыі, паведаміў БелТА афіцыйны прадстаўнік УСК па Брэсцкай вобласці Дзмітрый Іванюк».* Асноўнымі рысамі такіх лідаў з’яўляюцца інфарматыўнасць, зразумеласць, дакладнасць, дэмакратычнасць у выбары лексічных сродкаў.

З’яўляючыся прамежкавым звяном паміж загалоўкам і асноўным зместам публіцыстычнага артыкула, лід звязвае названыя кампаненты ў цэласны і звязны тэкст – такім чынам рэалізуецца інтэгратыўная функцыя. Разгледзім на прыкладзе: публікацыя мае загаловак «Маларытчанін стварае кнігу гісторыі горада», які паведамляе пра падзею, апісаную ў артыкуле; лід *«Валерый Савасціёнак – чалавек у Маларыце вядомы. Не, ён не вызначыўся алімпійскімі рэкордамі, не мае літаратурных прэмій ды іншых адзнак. Ён па крупінках збірае фотагісторыю горада»* скіраваны на ўдакладненне аднаго з кампанентаў загалоўка; першы ж абзац асноўнага тэксту публікацыі выглядае так: «Нястомны калекцыянер ходзіць па дамах і кватэрах гараджан, перапісваецца з сотнямі ўраджэнцаў свайго горада ў інтэрнэце. І ўсё для таго, каб сабраць больш здымкаў і звестак пра яго герояў ды падзеі…». Як бачна, кожная наступная частка артыкула лагічна выцякае з папярэдняй.

Некаторыя ліды анансуюць якую-небудзь падзею ці звяртаюць увагу на факт, адлюстраваны ў публіцыстычным творы. Ліды, што выконваюць рэкламную функцыю, могуць быць выражаны па-рознаму – ад указання на дату і месца пэўнага здарэння ці падзеі да выкарыстання дзеясловаў *паказвацца, пачынацца, адбывацца*, напрыклад, *«5 лістапада а 16-й гадзіне ў Музеі гісторыі прыватнага калекцыянавання адбудзецца адкрыццё выставы “Яніс Струпуліс. 100 медалёў” (Латвія)»; «Прыхільнікам якаснай беларускай музыкі раім наведаць канцэрт Šuta, што адбудзецца 2 снежня (нядзеля) у «Корпусе». На ім будзе прэзентаваны кліп на трэк «Хмаркі». Варта прыйсці!».*

У публіцыстычных лідах выкарыстоўваюцца разнастайныя экспрэсіўныя прыёмы, што дае магчымасць адрасанту ўплываць на свядомасць і эмоцыі адрасата. Ацэначна-экспрэсіўная функцыя такіх лідаў праяўляецца ў адлюстраванні аўтарскай ацэнкі і адносін да прадмета гутаркі і вызначаецца тым, што твор павінен пераканаць чытача ў тых палажэннях, якія абараняе аўтар, схіліць яго (чытача) на бок аўтара: *«Карэспандэнт Sputnik Алеся Шаршнёва пасля прагляду спектакля “Сон у купальскую ноч” расійскага рэжысёра Андрэя Прыкатэнкі не можа хаваць здзіўлення».*

Кампазіцыйная функцыя лідаў выразна праяўляецца ў выпадках, калі асноўны тэкст журналісцкага твора падзелены на некалькі частак, кожная з якіх мае сваю назву. Гэтыя назвы і пакладзены ў змест лідуючага абзаца. Такім чынам, у лідзе як бы прагназуецца пабудова тэксту і яго чляненне на часткі. Для прыкладу прывядзём лід *«У Беларусі змянілі правілы продажу асобных тавараў і працы [пунктаў] грамадскага харчавання. Так, крамы павінны будуць пазначаць цэны ў літрах і кілаграмах. Яшчэ адна змена тычыцца продажу непаўналетнім вырабаў, канструктыўна падобных да пнеўматычнай і кідальнай зброі…»* і адпаведныя яму назвы частак асноўнага тэксту «Кошт тавару будуць прапісваць за кілаграм і літр», «Крамы будуць прадаваць прадукты па цане, пазначанай на цэнніку», «Што зменіцца для рэстаранаў і кавярняў?».



Рэпазіторый ВДУ

Вылучальна-графічная функцыя лідаў рэалізуецца ва ўсіх публіцыстычных артыкулах СМІ: тэкст лід-абзаца аддзяляецца ад асноўнага зместу твора. Вылучаны колерам лід служыць своеасаблівым знакам, які сігналізуе пра існаванне асноўнага тэксту на пэўным месцы ў газетнай прасторы і прыцягвае ўвагу чытача.

**Заключэнне.** Такім чынам, заахвоціць чытача прачытаць менавіта гэты артыкул тут і цяпер – звышзадача любога публіцыстычнага ліда. Ролю лідуючага абзаца, на наш погляд, карэктна разглядаць у аспекце ўспрыняцця яго адрасатам, а таксама з улікам зместавай сувязі ліда з асноўным тэкстам журналісцкага твора. Даследаванне лідаў з пункту погляду функцыянальнага прызначэння паказала, што абсалютна ўсе ліды найперш скіраваны на выкананне інфарматыўнай функцыі. У адрозненне ад загалоўка, лід-абзац павінен не столькі прыцягнуць увагу сваёй незвычайнай формай, колькі лаканічна перадаць змест артыкула і заахвоціць адрасанта да далейшага ўспрымання інфармацыі. Функцыі, якія выконвае лід-абзац, цалкам залежаць ад мэты, якую ставіць перад сабой аўтар журналісцкага артыкула: праінфармаваць чытача, даць рэкламу пэўнага мерапрыемства, паслугу ці твора мастацтва, даць уласную ацэнку пэўнай з'явы, удакладніць змест загалоўка і інш.

1. Колесниченко, А.В. Практическая журналистика / А.В. Колесниченко // Заголовок, лид, концовка: Раздел 10. – М.: Издательство МГУ, 2008. – С. 99.
2. Лазарева, Э.А. Заголовок в газете: Учеб. пособие для студентов-журналистов / Э.А. Лазарева. Свердловск: Изд-во Урал. ун-та, 1989. – С. 69-72.

## ПРОБЛЕМА ОДИНОЧЕСТВА В РОМАНЕ МАРТИНА ЭМИСА «ДРУГИЕ ЛЮДИ: ТАИНСТВЕННАЯ ИСТОРИЯ»

***Малютина К.А.,***
*студентка 2 курса ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*
Научный руководитель – Глазман Л.Я., канд. филол. наук

Мартин Эмис – английский прозаик и критик, чье творчество сейчас действительно актуально, однако почти не исследовано. Проблема взаимоотношения людей в современном обществе достаточно широко раскрыта в его романах. На сегодняшний день эта проблема является актуальной, так как все больше и больше людей отстраняются от окружающего их мира. Сквозь призму постмодернистской философии Мартин Эмис в романе «Другие люди: таинственная история» воплощает в своем творчестве разные стороны человеческого общества и позволяет читателю задуматься об окружающей его действительности.

Цель работы – выявить идейно-художественное разнообразие мотивов одиночества в романе Мартина Эмиса «Другие люди: таинственная история».

**Материал и методы.** Наши наблюдения построены на материале романа М. Эмиса «Другие люди: таинственная история». Для художественного анализа романа мы использовали герменевтический и культурно-исторический методы исследования.

**Результаты и их обсуждение.** Роман Мартина Эмиса «Другие люди: таинственная история» с самого начала погружает читателя в общество, потерявшее нравственные ориентиры и находящееся в состоянии кризиса морального идеала.

Все персонажи данного романа находятся в кризисном состоянии, хотя некоторые из них этого не осознают, как, например, Шерон, которая говорит главной героине о том, чтобы та «не держала ее за алконавтку» [1, с. 37], хотя читатель видит, что через всю ее жизнь проходят алкоголь, наркотики и частые половые связи. Повествователь довольно иронично отзывается о таком типе персонажей, говоря, что «все бы мы были алкоголиками, если бы это было так легко» [1, с. 39]. Этот момент вызывает сомнение у читателя по поводу правильности мыслей рассказчика. И именно эмоция сомнения будет сопровождать читателя на протяжении всего произведения. Но как раз через эту эмоцию автор пытается донести тот скрытый смысл, который он вложил, как нам кажется, в основу своего произведения.

Этим скрытым смыслом является одиночество каждого отдельного человека среди других окружающих его людей. Этот смысл вырисовывается с первых глав произведения, когда читатель видит главную героиню, которая только что увидела мир, и смысл этот будет сопровождать повествование на протяжении всех глав.

В данном романе таким одиноким человеком является не только лишь главная героиня, но и все другие люди, которые встречаются ей на этапе ее становления.

Одиночество главной героини основано на ее отличии от других людей. Особенностью Мэри заключается в отсутствии прошлого, а значит, логично предположить, в отсутствии всех навыков взаимодействия с окружающим миром и обществом. С самого начала ее поведение и ее внешний вид буквально кричат о том, что она нуждается в помощи. Однако другие люди смотрели на нее с презрением и недопониманием. Все были зациклены на своих проблемах, чувствах, эмоциях и искали в главной героине решение этих самых проблем, совсем не задумываясь о том, что помощь прежде всего нужна была ей. Находясь в хаосе и круговороте людей, главная героиня смогла вернуть утраченное прошлое, но не захо-



Репозиторий ВГУ